В филиале кафедры физического воспитания и спорта организованы занятия по единоборствам. Основным видом единоборства является каратэ, что позволяет организовывать проведение совместных учебных и аттестационных семинаров.

Основной задачей учебных семинаров является обучение учащихся спортивной школы и студентов университета выполнению технически правильных движений, что является основой биомеханических параметров структурных компонентов каратэ [2].

Структура учебного семинара определяется программным материалом, состоящим из трёх разделов в зависимости от квалификации занимающихся. При этом спортсмены более старших поясов проходят программу всех трёх разделов, что предъявляет дополнительные требования к уровню подготовленности занимающихся и характеру функционального состояния скелетных мышц и приспособительных реакций в зависимости от характера мышечной адаптации [1, 3].

Программный материал учебного семинара определяется структурными компонентами, включающими раздел кихон элементов, изучение ката, соответствующего уровню технической подготовленности и квалификации занимающихся, а также программу расшифровки бункай ката. Длительность выполняемых действий накладывает определённый отпечаток на возможность выполнять технические элементы каратэ без ошибок. На данные параметры движения оказывают влияние кинезиологические особенности выполняемого действия, основанные на оценке функционального состояния скелетных мышц [5]. Характер временных параметров адекватности восприятия физических нагрузок скелетными мышцами определяется посредством неинвазивной диагностики механических характеристик мышечной ткани [4].

Учебная программа семинара по каратэ, как правило, подразделяется на три блока. В каждом блоке выделяются три учебно-тренировочных занятия продолжительностью два академических часа. При этом в зависимости от уровня квалификации младшая группа поясов занимается в блоке в течение одного занятия. Занятия в средней группе имеют продолжительность двух занятий. Каратэки старших поясов осваивают учебную программу на протяжении трёх занятий блока.

После освоения программного материала трёх блоков проводится аттестация на знание теоретической составляющей программного материала и владение техническими элементами каратэ соответствующего уровня. В качестве дополнительных теоретических и практических вопросов могут быть использованы структурные компоненты освоенных на семинаре технических действий и теоретических сведений. Успешно прошедшим аттестацию и сдавшим экзамен присваивается ученическая степень в каратэ (кю) или мастерский дан с присвоением права ношения пояса соответствующей цветовой окраски или дополнительной нашивки, а также диплома, подтверждающего уровень спортсмена.

**Литература**

1. Бондаренко, К. К. Изменение функционального состояния скелетных мышц под воздействием напряженной нагрузочной деятельности / К. К. Бондаренко, Е. А. Кобец, А. Е. Бондаренко // Наука и образование. – 2010. – № 6. – С. 35-40.

2. Старовойтова, Л. В. Биомеханические параметры ударных действий в карате / Л. В. Старовойтова, П. К. Грицева, К. К. Бондаренко // Актуальные проблемы физического воспитания студентов : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Чебоксары, 30–31 января 2019 г. – Чебоксары : Чувашская государственная сельскохозяйственная академия, 2019. – С. 504-507.

3. Фигуренко, И. А. Характер срочных адаптационных процессов в скелетных мышцах при выполнении ударных действий в каратэ / И. А. Фигуренко, К. К. Бондаренко // Здоровье студенческой молодежи: достижения теории и практики физической культуры на современном этапе : Материалы V Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 21–22 декабря 2006 г. – Минск : БГПУ им. М. Танка, 2006. – С. 89-90.

4. Шилько, С. В. Неинвазивная диагностика механических характеристик мышечной ткани / С. В. Шилько, Д. А. Черноус, К. К. Бондаренко // Актуальные проблемы медицины :

сборник науч.ных статей Респ. науч.-практ. конф. и 17-й итоговой науч. сессии Гомельского гос. медицинского ун-та, Гомель, 22–23 февраля 2008 г. – Гомель : ГомГМУ, 2008. – С. 161-164.

5. Яппарова, Д. О. Оценка функционального состояния скелетных мышц в каратэ / Д. О. Яппарова, К. К. Бондаренко // Спорт высших достижений: интеграция науки и практики : материалы IV Междунар. науч.-методич. конф., посвященной XXXII летним Олимпийским играм в г. Токио, Уфа, 25 марта 2021 г. – Уфа : Уфимский гос. нефтяной тех. ун-т, 2021. – С. 206-210.

*УДК 37.016:82:37.091.313:001.817*

***А. В. Брадзіхіна***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

## РЭФЕРАТ І ДАКЛАД ЯК ЭФЕКТЫЎНЫЯ ПРАКТЫЧНЫЯ ПРЫЁМЫ Ў СІСТЭМЕ ШКОЛЬНАГА НАВУЧАННЯ ЛІТАРАТУРЫ

Сярод практычных прыёмаў апераджальнага характару, якія дазваляюць эфектыўна развіваць аналітычныя здольнасці вучня, навыкі навуковага пошуку і сістэматызацыі інфармацыі, самастойнай працы, рацыянальнай яе арганізацыі, размеркавання часу, рэферат і даклад займаюць адметнае месца. У практыцы школьнага выкладання гэтыя метадычныя паняцці нярэдка змешваюцца, таму пачнем са зместавага напаўнення тэрмінаў і акрэслім розніцу паміж згаданымі відамі дзейнасці.

Рэферат мае на мэце аб’ектыўны кароткі выклад зместу адной ці некалькіх літаратуразнаўчых крыніц, а ў дакладзе абавязковым элементам з’яўляецца суб’ектыўная ацэнка гэтых крыніц вучнямі. Іншымі словамі, рэферат прадугледжвае асэнсаванне, сістэматызацыю і кампілятыўнае пісьмовае прадстаўленне пэўнай інфармацыі, даклад – найперш аналіз матэрыялу і арыгінальную яго ацэнку вучнем. Скажам, на ўроках па творчасці В. Быкава можна прапанаваць рэферат “Ваенная біяграфія Васіля Быкава” і даклад “«Альпійская балада» – аповесць і фільм: агульнае і адрознае”. У першым выпадку школьнік будзе аперыраваць гатовай інфармацыяй, другі патрабуе ад яго ўключэння аналітычна-даследчых здольнасцей.

Другая нявырашаная праблема заключаецца ў спосабах рэалізацыі гэтых прыёмаў на ўроках літаратуры ў школе. Для студэнтаў ВНУ даклад і рэферат з’яўляюцца даволі звыклымі відамі дзейнасці, метадычныя патрабаванні да напісання і афармлення якіх агавораны нават у міждзяржаўным стандарце (праўда, гэтыя патрабаванні даволі вольныя, таму, як правіла, універсітэты ўдакладняюць іх у адпаведнасці са спецыфікай свайго адукацыйнага працэсу). У сістэме школьнага навучання згаданыя апераджальныя заданні нярэдка выконваюцца фармальна: настаўнік прапаноўвае тэму рэферата, вучань яе гугліць, спампоўвае і раздрукоўвае першы ж адпаведны матэрыял, нават не чытаючы яго. У выніку выпускнік аказваецца непадрыхтаваным да патрабаванняў вышэйшай школы, якія прад’яўляюцца да такіх відаў работ.

Насамрэч і рэферат, і даклад як прыёмы навучання літаратуры ў школе патрабуюць ад настаўніка сур’ёзнай падрыхтоўкі. Неабходна не толькі лаканічна і ясна сфармуляваць тэму рэферата (даклада), але і прапанаваць агульны план (канкрэтызаваць яго належыць вучню) і прадставіць спіс літаратуры і інтэрнэт-сайтаў, дзе вучань можа адшукаць патрэбную інфармацыю. Лепш, калі заданне і пералік крыніц будуць запісаны на картцы, а не агучаны вусна. Колькасць пазіцый у такім спісе можа быць рознай – ад трох да дзесяці пунктаў. Гэта залежыць ад неабходнасці пры выкананні задання задзейнічаць усе крыніцы ці ад магчымасці выкарыстання іх на выбар школьніка. Калі рэферат (даклад) патрабуе звароту да

некалькіх манаграфій, то ў спісе літаратуры неабходна пазначыць старонкі (раздзелы), іншымі словамі, звузіць кола крыніц, выбраць сярод іх карэктныя і сучасныя ацэнкі. У сваю чаргу, вучань павінен мець дастатковую колькасць часу на выкананне апераджальнага задання, а настаўніку трэба азнаёміцца з прадстаўленымі вынікамі да ўрока, на якім гэты рэферат ці даклад павінен быць агучаны ці абаронены.

І даклад, і рэферат могуць быць як выключна пісьмовымі справаздачнымі формамі, так і патрабаваць вуснай прэзентацыі. Мэтазгоднасць той ці іншай падачы матэрыялу вызначае настаўнік у залежнасці ад тэмы апераджальнага задання, яго мэты і нават узроўню падрыхтаванасці вучня. Пад апошнім разумеецца якасць выканання задання і карыснасць такой інфармацыі для астатніх дзяцей у класе. Рэферат ці даклад нізкага ўзроўню не патрабуе агучвання, бо не палепшыць веды іншых вучняў. Гэта хутчэй марная трата часу на ўроку. У выпадку няякаснага выканання апераджальнага задання вучнем настаўніку лепш абмежавацца абаронай рэферата, задаўшы яго аўтару некалькі пытанняў па змесце.

З праблемай таймінгу звязаны і аб’ём рэферата. У “Метадычных рэкамендацыях па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі” ад 07 ліпеня 2022 года [1] указана, што навучальны рэферат як від дзейнасці прапануецца вучням толькі старэйшых класаў у наступным аб’ёме: X клас – 12–14 друкаваных старонак (шрыфт Times New Roman, кегель 15 пт, міжрадковы інтэрвал – 1,5), 14–15 – рукапісных; XI клас – 15–17 друкаваных старонак (шрыфт Times New Roman, кегель 15 пт, міжрадковы інтэрвал – 1,5), 17–19 – рукапісных. Патрабаванні да даклада ў дакуменце не ўказаны зусім.

Відавочна, што пры строгім падыходзе да захавання ўказанага аб’ёму настаўнік сутыкнецца з шэрагам праблем. Найперш у такім выпадку рэферат набудзе выключна пісьмовую форму, бо вуснае агучванне школьнікам 12–19 старонак тэксту па самых аптымістычных падліках зойме 30–40 хвілін, што не можа сабе дазволіць настаўнік на ўроку. Па-другое, улічваючы кліпавае мысленне і хуткасць жыцця сучаснага чалавека – а менавіта ў такім соцыуме будуць жыць сённяшнія дзеці, – методыка павінна акцэнтаваць увагу не так на аб’ёме рэферата (і пагатоў даклада), як на паўнаце асвятлення прапанаванага пытання. Многія вучні, атрымаўшы заданне напісаць вялікую колькасць старонак, будуць імкнуцца не столькі раскрыць тэму (а яе лаканічнае раскрыццё патрабуе не механічнага перапісвання ці капіравання, а ўдумлівага асэнсавання тэксту), колькі набраць неабходны аб’ём старонак. Па-трэцяе, сучасная праграма па беларускай літаратуры пабудавана такім чынам, што з дзявятага класа дысцыпліна вывучаецца згодна з гісторыка-храналагічным і тэарэтыка-літаратурным прынцыпам. Нават апошнія карэкціроўкі праграмы 9 класа, якія тычацца выключэння з яе аглядавых тэм, істотна не змянілі падыходаў да вывучэння літаратуры. Так, творчасць пісьменнікаў разглядаецца манаграфічна, уключаны звесткі пра біяграфію аўтара, захаваны храналагічны і культуралагічны прынцыпы. Іншымі словамі, падыходы асэнсавання літаратуры ў 9 і 11 класах падобныя, а таму навучальныя рэфераты трэба прапаноўваць ужо дзевяцікласнікам (на наш погляд, яны будуць карысным і даступным відам дзейнасці і ў сёмым–восьмым класах).

У пэўным сэнсе падрыхтоўчым этапам да напісання рэфератаў і дакладаў у сярэднім звяне можа стаць такі метадычны прыём, як паведамленне. Пад гэтым тэрмінам разумеецца загадзя падрыхтаванае кароткае вуснае выступленне вучня па прапанаванай тэме. Методыка працы з ім блізкая да іншых апераджальных заданняў, галоўная розніца – у аб’ёме і спосабе прэзентацыі. Калі рэферат дапускае чытанне створанага школьнікам тэксту, то паведамленне прадугледжвае вуснае выказванне без візуальнай апоры.

Яшчэ адна важная праблема ў навучанні сучасных школьнікаў працейшым відам навуковай дзейнасці – даступнасць інфармацыі. Імклівае развіццё навукова-тэхнічнага прагрэсу прыводзіць да таго, што вучні імкнуцца выбраць лёгкі шлях з дапамогай інтэрнэту, проста “скачваючы” гатовыя рэфераты. Каб мінімалізаваць рызыку выканання заданняў падобным чынам, настаўнік павінен сур’ёзна падысці да фармуліроўкі тэм і распрацоўкі